**КЛЕЯВІЧЫ** – вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце, за 18 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 177 км ад Магілёва, на р. Бесядзь (прыток р. Сож). Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Саматэвічы – Касцюковічы. 2 гаспадаркі, 4 жыхары (2007).

Выяўлены археалагічны помнік - гарадзішча, якое размешчана за 2,5- 3 км. на паўднёвы ўсход ад вёскі, сведчыць, што гэтая мясцовасць была заселена людзьмі ў глыбокай старажытнасці. У 18 ст. (1762) вядома як сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У 1777 г. згадваецца як с. Клевічы ў Чэрыкаўскім павеце. У 1799 г. 42 двары, 240 жыхароў, уладанне памешчыка. Па рэвізіі 1811 г. вёска, 32 сялянскія душы, уладанне памешчыка Івана Цеханавецкага, у 1833 г. у вёсцы 286 жыхароў, уладанне памешчыцы Саламеі Гайковай. У 1858г. 252 жыхары. На 1880 г. вёска пры р. Бесядзь, 55 двароў, 274 жыхары, у Саматэвіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У вёсцы апрача земляробства былі распаўсюджаны бандарны і кравецкі промыслы. Адносілася да Беладубраўскага праваслаўнага прыхода Ражства-Багародзіцкай царквы. Паводле перапісу 1897 г. – 92 двары, 721 жыхар, у Саматэвіцкай воласці Клімавіцкага павета.

У пачатку 20 ст. вёска. Вясковай грамадзе належала 616 дзесяцін зямлі. У 1909 г. вёска на паштовым тракце, 92 двары, 622 жыхары. У 1910 г. адкрыта народнае вучылішча, для якой у 1930 г. пабудавана ўласнае памяшканне. З 20.08.1924 г. вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. Па перапісе 1926 г. у вёсцы 68 двароў, 393 жыхары. У 1930 г. быў створаны калгас імя Варашылава, працавала кузня.



У Вялікую Айчынную вайну 29.09.1943 года вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У брацкай магіле пахаваны 11 воінаў. Паводле перапісу 1959 г. – 676, у 1970 г. – 406 жыхароў. У 1986 г. – 44 гаспадаркі, 118 жыхароў , Клеявічы-2 – 88 гаспадарак, 236 жыхароў, у складзе калгаса “Дуброва”. У 2002 г. – 5 гаспадарак, 7 жыхароў. Забудова драўляная, сядзібнага тыпу. Побач залежы пяскоў. Радзіма беларускага пісьменніка, Ганаровага грамадзяніна Касцюковіцкага раёна Леаніда Кірэевіча Левановіча.



Л.К. Левановіч

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС частка жыхароў адселена ў в. Белая Дуброва.